# ИСТОРИЯ

УДК 39

## ЧАРАДЗЕЙСКІЯ ПРАКТЫКІ Ў РАМКАХ БЕЛАРУСКАГА ТРАДЫЦЫЙНАГА ВЯСЕЛЛЯ

***І. Г. БОНДАР***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*Вяселле як рытуал пераходнага тыпу мае значэнне сімвалічнай мяжы і яе перасячэння як у прасторавым, так і сацыяльным плане. У этнаграфічных апісаннях беларускага традыцыйнага вяселля даволі часта можна сустрэць звесткі пра выпадкі шкоднаснага магічнага ўздзеяння на маладых і іншых удзельнікаў вясельнага абраду. Чарадзейства, у народнай традыцыі, абагульненае найменне ўсіх выпадкаў магіі, якія маюць шкоднасны ўплыў на навакольны свет . Яно закранала ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека, у тым ліку і вяселле.* М*агічныя практыкі ў рамках вяселля маглі мець як шкаданосны, так і апатрапейны характар.*

***Ключавыя словы:*** *чараўніцтва, чарадзейскія практыкі, вяселле, сурокі, доля маладых, расліны.*

Вяселле – комплекс абрадаў і звычаяў у спалучэнні з разнастайнымі фальклорнымі элементамі (песні, музыка, танцы, гульні і інш.), закліканы аформіць і ўзаконіць змену сацыякультурнага статуса яго галоўных удзельнікаў – маладога і маладой – у рамках вясковай супольнасці. Паступова праходзячы ўсе этапы рытуала, жаніх і нявеста пазбаўляюцца ўсіх характарыстык старога (маладзёвага) статусу і набываюць прыкметы, уласцівыя новаму статусу жанатых (дарослых) людзей.

Прамежкавы (лімінальны) этап – мяжа паміж двума станамі, падчас якой лімінальный персанаж знаходзіцца ў няпэўным стане, пазбаўлены прыкмет як старога, так і новага статусу. Лімінальныя персанажы вяселля – маладыя, пазбаўляюцца прыкмет сваёй культуры. Маніпуляцыі з валасамі, такія як расплятанне касы, падстрыганне і падсмольванне валасоў, пазбаўлялі маладых прыкмет іх ранейшага стану [8, с. 76]. У час пераходу ад старога статусу да новага, маладыя асабліва ўспрымальныя да рознага роду магічных уздзеянняў, таму на вяселлі актыўна выкарыстоўваюцца разнастайныя сімвалічныя прыёмы ўплыву на маладых з мэтай фарміравання пажаданых якасцей і ўласцівасцей, што неаднакратна фіксуецца этнаграфічнымі матэрыяламі. *“ Як на вяселлі дзядзька Васіль падарыў, пабагаславіў мяне, а тады кажыць: “Да пусьць мінае нас усякая бяда – Тут жэняцца Саўскі Бор і Слабада. А мы дзевачкі не ўрочныя,А мы дзевачкі малочныя". Гэта каб ніхто не урок, каб было ў грудзях (малако)”* [10, с. 56].

Чараўніцтва не з’яўляецца структурным элементам вясельнага рытуалу, а ўносіць у яго ход дэструкцыю і негатыўна ўплываць як на ўдзельнікаў абраду ў цэлым, так і на шлюбную долю маладых. Усе благія выпадкі (хваробы, дзіцячая смяротнасць, адсутнасць дзяцей і інш.) звязваліся вяскоўцамі з магымымі чарамі, учыненымі ў часе вяселля. *“Пад час вяселля, калі хтосьці з дружыны гарыць гневам да маладой, то каб у яе ў будучым паміралі дзеці, ен павінен знайсці хоць адзін лісток “ляды” (дзікага гарошку) ці руты з вянца, які упрыгожвае ей галаву, і кінуць лісток на першую стрэчную магілу”* [3, с. 217]. Але магічныя практыкі ў рамках вяселля маглі мець як шкоднасны, так і апатрапейны характар. Маладой, каб ніхто не сурочыў і не зачараваў яе, давалі пры ад’ездзе пад вянец, а то і на ўвесь час вяселля галоўку цыбулі [2, с. 545].

Калі ў вёсцы быў чараўнік, то яго абавязкова запрашалі на вяселле, гэта было праявай, хоць і баязлівай, але павагі да чараўніка, таксама такім чынам чараўнік падтрымліваў сваю асабістую негалосную ўладу ў вёсцы. Ведзьм амаль ніколі не запрашалі на вяселле, ад чаго некаторыя крыўдзіліся. *“Ну ехалі ўжо ад нявесты к жаніху. І выйшла эта самая старуха. А ён яе на свадзьбу не пазваў. Яны жылі так па суседству. Так, як во ў мяне эта суседка жывець цераз дарогу. “Ну што, – гаворыць, – на свадзьбу не пазваў, ну хоць на пахароны прыду” [... ]Так ён нявесту эту завёў у хату, за стол пасадзіў, а сам цераз стол, і як пабег. І там у нас такі ёсць лес. Прыбег у эты лес і крычыць: “Дружок, дай руку”. І вы знаеце, па такому дзераву забраўся, што там ні сучка не было, нічога, як нячыстая сіла яго ўзнесла туда. Тады там лесніцы звязвалі, штоб яго какнебудзь дастаць, штоб ён не мог задавіцца. А ён адной рукой ужо дзержыцца, а другой рамень адшпільваець – на рамню будзець вешацца”* (Віцебскі р-н) [11, с. 71].

Абавязковае запрашэнне чараўніка на вяселле мае дваістае тлумачэнне. Па-першае, ён выступаў своеасаблівым абярэгам для маладых, то бок ён мог выявіць і абясшкодзіць чары, зробленыя на маладых, або пакараць таго, хто збіраўся гэта зрабіць, або ўжо зрабіў. *“Свадзьба была. А ў нас быў чараўнік. І не пазаві – здзелаіць. І пазаві – можаць здзелаць. Алі еслі хто здзелаіць, то можаць аддзелаць. Ста-*

*раліся падлажыць (чары) у той узёл, дзе будуць спаць. А ён усё нашоў. Узяў, прыносіць з утра сюды, дзе хазяйка будзець печ тапіць і гаворыць: “Як толькі первы дым пакажацца, закіньця туды за дровы”. Як закінулі – прыбігаіць баба нагала, качаргу ўхапіла, абжаргала (асядлала) і скрозь дзярэўні ўзад-упярод. А так бы маладыя гэдак раздзеліся і бегалі” (Верхнядзвінскі р-н)* [11, с. 32].

Па-другое, прысутнасць чараўніка ў якасці аднаго з цэнтральных дзеючых персанажаў рытуалу, дзе фармуецца новая сямейная адзінка сельскай грамады, адпавядала яго ўласнай стратэгіі, якая заключалася ва ўсталяванні і падтрыманні асабістай улады ў вясковым соцыуме [5, с. 215].

Але калі чараўніку не аказвалася належнай увагі, то тады вяселле магло скончыцца драматычна. Яшчэ ў першай палове XIX ст. вядомы беларускі літаратар Ян Баршчэўскі апісаў канфлікт Парамона (чараўніка) з Акімам і Грышкай, тыя абвінцавалі чараўніка. У адказ на гэта Парамон загаварыў гарэлку, а Акім з Грышкай пачалі плясаць ды іграць на дудзе, пакуль чараўнік не насыціўся помстай [1, с. 19-20]. Такая мадэль узамаадносінаў чараўніка з вясковай грамадой была вельмі трывалай і захоўвалася да XX ст., пра што сведчаць матэрыялы палявых даследванняў. “*Вот я гэта, як вышла замуж у дзярэўню Пранікі. Там расказвалі, была свадзьба, і аднаго мужчыну там не ўгасьцілі: не далі там выпіць. Ну і ён, вродзе, падробіў маладой, што яна завалілася, як нежывая. Тады і дагадаліся. І ўгасцілі. І ўсе было харашо*” *(Ушацкі р-н)* [11, с. 32]. Аналагічную з’яву, калі чараўнік на вяселлі карае непрыяцеляў, у першай палове XIX ст. апісаў вядомы беларускі літаратар Ян Баршчэўскі [1, с. 19-20], што ўказвае на трывалы і кансерватыўны характар падобных уяўленняў. У час канфлікта з чараўнікамі, ні палажэнне людзей у соцыўме, ні пол не гулялі ніякай ролі ў пакаранні крыўдзіцеляў. “*А гэта шчыталася, як бы ўжо шляхціч жаніўся. [...]музыка была, танцаваць пашлі [...] ён гэтага во так локцем гэтага Івана тауханўў [...] “ты не будзеш тут стаяць, батрак, каля мяне”. А гэты тады: “Ах, як так, ах ты, шляхціч, ды пархаты, будзеш ты мяне падштурхоўваць”. Ён плюнуў і з хаты вон. Уся свадьба, што прыехалі і што былі, з-за столу вон [...] усе здзеліся і садзяцца тут усе [...] усе пазналі, што гэта Іванава работа [...]Разьдзеліся ды пасадзіліся [...] дагадаліся, што нада іцьці ка Йвану [...] Ён прышоў і толька плюнуў, і яны ўсе паўставалі, панадзяваліся” (Ушацкі р-н)* [10, с. 226].

Таксама варта адзначыць, што ў наратывах пра канфлікты з моцнымі чараўнікамі на вяселлі ў якасці пакарання часта фігуруе з’ява launch ператварэння чараўніком людзей у ваўкоў. “*Адна пара жанілася, сваьба ў нас была. А саседа ні прыгласілі. А ён што здзелаў. Быў, казалі, чараўніком быў. Дык дзеўка гэта ваўчыцай абярнулася, а жаніх – ваўком, бегаюць па полю. Дык таго чалавека прыгласілі, напаілі. А каб адддзелаць, ён іх цераз ізгароду турнуў. Во як было*” *(Ушацкі р-н)* [11, с. 52].

Да найбольш распаўсюджаных уздзеянняў адмоўнага характару варта аднесці сурокі. Сурокі – немач, псота ці іншае няшчасце, выкліканае благім поглядам, словам ці думкамі ў бок чалавека. Сурокі бываюць як зламысныя, так і ненаўмыснымі. Таму на ўсіх этапах вяселля прадпрымаецца шэраг захадаў апатрапейнага характару менавіта ад сурокаў. То бок разнастайныя прадметы выкарыстоўвалі у якасці абярэгаў. Найчасцей гэта шпілька, ці іголка, уваткнутая ў адзенне галоўкай уніз [9, с. 190].

У магічных практыках з ахоўнымі мэтамі выкарыстоўваецца мноства зёлак, а ў вясельнай абраднасці існуе шмат павер’яў, звязаных з раслінамі. *“Каб ніхто не сурочыў і не “зачараваў”, маладая бярэ з сабой галоўку цыбулі ці часныку і носіць увесь час на вяселлі”* [4, с. 120]. Падчас вяселля, як моманту небяспечнага, расліны часта ўжывалі ў якасці апатрапея. Множнасць мака абумовіла выкарыстанне яго ў якасці абярэга, яго клалі ў чаравікі нявесце [7, с. 300]. “Княгіня”, едучы да шлюбу, бярэ з сабою сушаныя грушы-дзічкі і кідае іх на кожную стрэчную дарогу ці сцежку – каб не было на яе “ўразак” ніякіх [3, с. 200].

Існуе шэраг абрадавых дзеянняў, накіраваных на “праграмаванне” долі маладых. Напрыклад, звычайна жменьку ці хаця б шчопаць льнянога насення маладая, выязджаючы да шлюбу, хавае за пазухаю, а калі стане перад алтаром, стараецца неўпрыкмет аслабіць “паясніцу”, каб зерне пасыпалася на дол. Гэта спрыяе лёгкасці будучых родаў [3, с. 200]. Каб нараджаліся сыны, нявеста пад час вянчання трымала за пазухаю гарэхі. У этай сітуацыі акцэнтавалася іх суаднесенасць менавіта з мужчынскім пачаткам [6, с. 227]. Асаблівая роля адводзілася начынню пасцелі. У якасці абярэгаў ад сурокаў у ложак маглі класці таўкач, нож, серп. А збожжа, вывернуты кажух – мусілі спрыяць плоднасці і багаццю маладых [6, с. 230].

Такім чынам, у структуры традыцыйнага беларускага вяселля магічныя практыкі займалі важнае месца. У час пераходу ад старога статусу да новага, маладыя асабліва ўспрымальныя да рознага роду магічных уздзеянняў, таму на вяселлі актыўна выкарыстоўваюцца разнастайныя сімвалічныя прыёмы ўплыву на маладых. Калі ў вёсцы быў чараўнік, то яго абавязкова запрашалі на вяселле, бо ён выступаў своеасаблівым абярэгам для маладых, то бок ён мог выявіць і абясшкодзіць чары, зробленыя на маладых, або пакараць таго, хто збіраўся гэта зрабіць, або ўжо зрабіў. Але калі чараўніку не аказвалася належнай увагі, то тады вяселле магло скончыцца драматычна. Сурокі –найбольш распаўсюджаны ўздзеянне адмоўнага характару, таму на ўсіх этапах вяселля прадпрымаецца шэраг захадаў апатрапейнага

характару. У магічных практыках выкарыстоўваецца мноства зёлак, найчасцей ў якасці апатрапея, і накіраваны на змену характарыстык долі маладых.

ЛІТАРАТУРА


1. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. – 214 с.
2. Васілевіч, У. Цыбуля / У. Васілевіч // Беларуская міфалогія : Энцыклапедычны слоўнік. - Мінск: Беларусь, 2004. – с. 545.
3. Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / Укл., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 607 с.
4. Зямная дарога ў вырай. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3 – Мінск : Беларусь, 2010. – 717 с.
5. Лобач, У. А. Вобраз чараўніка ў традыцыйнай карціне свету беларусаў Падзвіння XX – пач. XXI ст. (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый ПДУ) / У. А. Лобач // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў. - Полацк, 2014. - Ч. 2. - С. 213–219.
6. Лобач, У. А. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры / У.А. Лобач // Studiamythologicaslavika. 2003. - с. 205 – 248.
7. Малоха, М. Мак / М. Малоха // Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік. - Мінск: Беларусь, 2004. – с. 300.
8. Мішына, В. І. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў: гісторыка-культуралагічны аспект: вучэбна-метадычны комплекс: вучэб.-метад. комплекс для студ. спец. 1-21 03 01 “Гісторыя” / В. І. Мішына. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – с. 220.
9. Мішына, В.І. Шкоданосная магія ў традыцыйным вясельным абрадзе беларусаў Падзвіння: светапоглядныя асновы і механізмы дзеяння (др. Пал. Xix – перш. Пал. Xx стст.) / В. І. Мішына, П. І. Мішін // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў. - Полацк, 2011. - Ч. 2. - С. 189-193.
10. Полацкі этнаграфічны зборнік/ склад. У. А. Лобач, У. С.Філіпенка. – Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. - Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.
11. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 368 с.